Данута Бічэль

# Дайсці да каложы



Данута Бічэль

# ДАЙСЦІ ДА КАЛОЎЖЫ



Данута Бічэль

# ДАЙСЦІ ДА КАЛОЖЫ

## *Малітвы, медытацыі, вершасказы*

Мінск
«ПРО ХРЫСТО»
2017

УДК 821.161.3-821
ББК 84(4Беи)
Б 99

На вокладцы кнігі:
«Каложа». Мастак *Сяргей Шэмет*

ISBN 978-985-7074-82-2

© Бічэль Д.Я., 2017
© Афармленне. УП «Выдавецтва
"ПРО ХРЫСТО"», 2017

## Дайсці да Каложы

Беларусь — гэта дарога... Гасцінец, па якім я хадзіла ў дзяцінстве, бяжыць з Дакудава на Місуры, з поўдня на поўнач. А вайна хадзіла па нашым гасцінцы з усходу на захад і наадварот, бо простых дарог не было.

Нарэшце праклалі дарогу з Еўропы ў Мінск, перакрыжавалі наш Гасцінец, і наша хата згарэла ахвярным крыжам разам з зяцем маім Сяргеем Ільіным, які любіў гэтую хату, таму, разгублены, ускочыў у агонь і атруціўся ўгарным дымам, а цяпер прыходзіць у мае сны...

Па гасцінцах-дарогах пракочваюцца войны і ходзяць ды ездзяць добрыя людзі — хто ў сваты, хто ў госці, хто па грыбы. Усе людзі любяць хадзіць, а паэты ў рытм хады складаюць вершы, гусляры спяваюць пад гуслі, дудары на дудачках граюць... Нашы дарогі спыняюцца каля крыжа, вядуць да святыняў.

Дайсці да Каложы...

Калі трэба было ехаць у свет, я не паехала ў Мінск, як уся моладзь Беларусі, мусіць, ад страху выбрала напрамак на Захад — у Гродна, па цячэнні Нёмана. У дзявоцтве найважнейшую справу свайго жыцця я прыняла несвядома, але ж Нехта, Невідочны, кіраваў гэтым несвядомым выбарам.

Калі Эрык Загнетаў запрасіў мяне на каву ў домік, з вакна якога відаць былі Нёман і Каложа, гэтая відзежа вызначыла далейшыя мае дзействы: я прыйшла да Каложы і пры ёй засталася.

Прывяло мяне Божае слова. Бяссмерце продкаў маіх — Каложа, — напісала я ў раннім вершы. Каложа,

адчуванне несмяротнасці і глыбіні народа, грэла, натхняла, вызначала шлях, пошукі слова, усё маё шчаслівае жыццё. Шчаслівае, бо праз Каложу прысвяцілі мне вершы два вялікія айчынныя паэты — Ларыса Геніюш і Уладзімір Караткевіч. Ён і адчыніў мне дзверы царквы, калі ўпершыню прыехаў у Гародню вясной 1965 года.

Каложская Божая Маці, Адзігітрыя, абразок віленскай школы, які па легендзе насіў на шыі жабрак і перадаў у Каложу, ратавала мае вершы, дзяцей, горад, краіну. Цудоўны абраз быў вывезены ў Расію ў 1915 годзе, але адлегласці ў Бога не маюць значэння.

Каложа доўга была зачыненая, ды сцены яе нас трымалі. Я веру ў легенду пра тое, што чорныя валуны, умураваныя ў плінфы ў алтарнай частцы, вылечваюць болесці, таму прытуляюся да сцяны Каложы. Шліфаваныя каляровыя маёлікавыя пліты ў форме крыжыкаў натхняюць ткачых, мастакоў, цесляў, дойлідаў, кавалёў, музыкаў, паэтаў. Цяпер святыня адчыненая, туды можна зайсці, памаліцца на святой літургіі па-праваслаўнаму, можна і ў цішыні стаць на калені, падысці і пацалаваць абраз, запаліць свечку, прысесці на лаўку перад Маці Божай Каложскай і паразмаўляць з Ёю, як з Маці. Можна пагладзіць збанкі-галаснікі, гукнуць туды, у той далёкі час, у XII стагоддзе — і адгукнуцца галасы продкаў, найвялікшы скарб!

Беларусь — гэта даліна, але Гродна пабудаванае на пагорках. Кожны сябра выбраў свой найвышэйшы пагорак. Фарны касцёл нібы і не на пагорку стаіць, але вежы яго відаць адусюль — я малюся ў фарным касцёле.

Святая Каложа стаіць на самым высокім пагорку — гэта архітэктурная пярлінка, унікальны помнік мураванага дойлідства майстроў гродзенскай архітэктурнай школы, пабудаваная ў гонар святых Барыса і Глеба ў 1180-х гадах на правым крутым беразе Нёмана, адзіны помнік, што захаваўся ва ўсёй Усходняй Еўропе і не мае аналагаў у тагачасным дойлідстве. Назва Каложань — ад месца, дзе б'юць крыніцы. Унутры шасціслупковы (слупкі круглыя) трохапсідны храм з дадатковай прасторай у перадалтарнай частцы. Нават фрэскі былі знойдзены ў 1970 годзе.

Колькі, нібы з апраметнай, падала бомбаў, снарадаў, розных выбухаў, пажараў, але Каложы яны не зруйнавалі...

У ноч на 2 красавіка 1853 года сцяна Каложы абвалілася ў Нёман, але рака не вінаватая. Каложа так прастаяла 40 гадоў. У 1906 г. храм умацавалі больш лёгкай драўлянай сцяной, на даху збудавалі невялікі купал з ажурным крыжам. Умацавалі круты бераг. А якраз цяпер, восенню, пачалі рэстаўрацыю драўлянай сцяны Каложы.

Дайсці да Каложы... Вярнуцца да сваіх, не заблудзіць, не пераблытаць сцяжынку, якая вядзе да святыні, да Бога, да таты і мамы, да продкаў, пакінуць гэты шлях сваім дзецям, унукам, сябрам, родным людзям, не страціць душы...

*Аўтар*

# ЦІШЫНЯ

## Вадохрышча

Ксёндз Казімірас Жыліс
на літоўскіх азёрах вырас.
Служыў Пану Богу шчыра
над рэкамі і ставамі, —
пасля дожджыку ў небе вясёлкі
над касцёламі паўставалі...
збаночкі, кнігаўкі, зёлкі...
Казімірас купаўся на золку,
будзіў на возеры хвалі,
пакуль жабкі на возеры спалі...

Мова Жыліса — гэта нібы немаўля
нешта шчабеча да мамы...
І вернікі гэтаксама
разумелі Казіміраса Жыліса,
калі з ім шчыра маліліся.

На Вадохрышча па-праваслаўнаму
ксёндз за Хрысціцелем Янам
акунаўся ў хвалі святога Ярдану,
грудзі прыкрыўшы
толькі Хрыстовым крыжам...

Але ж ён штодзень гэтак робіць —
на глыбіні і вышай
да анёльскіх палётаў
верных людзей выводзіць
гэтых аматараў экстрэмальных прыгодаў...

Ад невылечных хваробаў адна дапамога —
вера ў Змёртвыхпаўстанне і ў Духа Святога...

Цяпер ксёндз Жыліс не з намі —
у законе сваім, за святымі мурамі...
Зрэдку наведвае Гродна, —
прыцягвае вадзіца родная...

Але настане Хрыстова хрышчэнне,
і ксёндз перапыніць сваё лячэнне,
распранецца ўвішна, як хлопчык,
першы з крыжам у проламку ўскочыць.

## Грамнічка

Цінькае зранку сінічка:
— Прыйдзе, прыйдзе вяснічка!
Каташкі, як свечачкі, — вербы ў гаі
ды на беразе сонечнай Гаўі...
Запаліцца свечка-грамнічка,
Святога Духа прамень,
Маці Божае завушнічка,
святлічка, жывы агмень...

Ахова людскога дому,
аберагай нас ад грому...
Знакам крыжа ачысці
ад змроку куткі-закуткі,
выганяй нашы смуткі,
замарочкі і баламуткі...

Таямніца-грамніца,
ты нашай смерці сястрыца.
Душу вымеш з цела, як з дрэва, —
няхай ляціць, куды трэба...
Пагрэй нас, халодных, употай
перад зямной адзінотай...

Крыж на ўзгорку наведвай часцей,
ад жывых адганяй чарцей,
не спальвайся да астанку,
хавайся ў шклянку!

Не баімся цябе, злы дух,
ты нам не зробіш нічога...
Знішчае твой чортаў нюх
дыханне Духа Святога...

На святыя Грамніцы
ў палавіне зіміцы
будзем шчыра маліцца,
каб самім не спаліцца.

## Папялец

Ты пярэчыш, што гэта версет?
Не, гэта проза-верш.
Я пра вершы, мілы сусед,
ведаю лепш...

Дзве вярбінкі, ад княскай Вільні
падарункі — адна ад Вікі,
другая — ад Сапач Тані...
спальваюцца на світанні...

Попел святар пасыпаў на лоб.
Благаславіў і рукі паскроб
на развітанне.

Благаславі нас, Божа...
Благаславі нас, ксёнжа,
святым попелам...
Спаленым полем...
Спаленай доляй...

Самі сагрэемся болем
зблізку на прысаку,
дзе мелі прапіску...
паслухаем пліску.

Знайшла іржавы кручок,
якім зашчаплялася
ў спаленай хаце акенца...
Куды падзецца?
Усяму прыходзіць канец.
Папялец...

Не шкада мне зіміцы —
замятае яна сурова...
Але каму будзе сніцца
маё ціхае слова?

## Звеставанне

Прачыстая Панна Марыя
ў крынічцы сувой паласкала,
Арханёла Габрыэла спаткала,
Богу праз яго адказала,
па-дзявоцку, нібы выпадкова:
— Вось Я, Слуга Пана,
няхай Мне станецца
паводле Тваіго Слова...

І прыйшло нам Збаўленне...

Нёман разліўся паводкай
на зёлкавым лузе,
на прыступку з халоднага каменя
паклаў мяне ў клуначку буслік!

Буслік, буслік, чырвоныя боты,
на світанні падкінь пад паветку
прывітанне ці новую вестку,
ад святой наіўноты
пра тую святую паводку,
у якой бялілі палотны
мае аднагодкі
і мае шчаслівыя цёткі,
пра той пастаўнік,
у якім у гразі паласкаўся
ценячок, твой двайнік,
пра залатую лотаць,
над якою ты

ўсё яшчэ рассыпаеш свой малады,
шчаслівы бусліны клёкат,
узнімаючы нашы мары
ад Сожа да Шчары
пра бусліную нашу краіну,
за якую жыццё спапяліць мы павінны.

Буслік, буслік,
ты наш Богам абраны край
з анёламі ў небе злучай!

Добры Божа!
Што з волі Тваёй пачалося,
закруцілася, пераплялося, —
тое бясследна знікнуць не можа!

## Вербніца

Простыя людзі таго не ведаюць —
агонь з вадою злучаецца вербамі.
Ды ёсць жа лекі з Божай аптэкі
на ўсе хваробы і небяспекі...

Нарэшце ўсё нанова пачнецца...
На золку дубчык вярбы прачнецца,
Нехта заплача ці засмяецца,
Нехта адчыніць кляновыя сенцы...

Нехта святлом асвеціць хацінку,
дубчыкам злёгку палечыць дзяўчынку,

ў збанок паставіць тоненькі дубчык —
хвораму сэрцу збаўленне-любчык...

Усмешкай сонейка заіскрыцца...
Вярба — дачушка мерзлай зямліцы,
нап'ецца з возера ці з крыніцы,
ў адно імгненне ўся распушыцца.

— Не мама б'е, вярбінка б'е!
За тыдзень Вялікдзень! Бог любіць цябе!
— Святая Вербніца — жыццё адменіцца!
Сын Божы з неба дадому вернецца!

Прачнуся ранкам чакаць Вялікдзень,
З простай малітвай сяду паснедаць,
зялёны луг праб'ецца з-пад снегу,
і мама ў сон на досвітку прыйдзе!

Светла пра маму і тату думаю!
Светла за іх прымаю Камунію.
Найпрыгажэйшыя шчасця дарункі —
дубчык свянцоны, маміны рукі.

## Споведзь

Мама кажа: — Хачу да споведзі.
Кажу ёй:
— У брыгітак цяплей...
— Не, давядзі мяне да Ружанцовай!
Яна мяне разумее найлепш.

Падняла, як дзіцятка, да спавядніцы.
І пачалася святая Імша...
Людзі не бачаць у кантэмпляцыі,
што мама стаіць, а ёй трэба ляжаць.

Прыняла святую Камунію.
Езус Хрыстус даў моцы крыху...
Зусім аслабла, як выйшлі на вуліцу —
а я на руках яе не данясу...

Езус заўважыў, і цуд адбыўся:
прыслаў насустрач нашу Марысю —
з Марысяй рукі спллялі, як на крэсле,
так да кватэры маму данеслі...

## Надзея на адпушчэнне грахоў

Везла я грахі свае цяжкія
да айца Уладзіслава Чарняўскага —
ён маё апраўданне паслухаў крыху,
перабіў... і пачаў ад пачатку,
ад першых крокаў і па парадку —
выцягваў з мяне па граху,
без наркозу, як з цела занозы,
як змяіныя ўкусы,
як трывожныя восы,
як пчаліныя джалы,
як з сэрца кінжалы,
як вострыя стрэлы, —
мне так балела, ды я цярпела,

нібы па прысаку, вёў мяне босую,
нібы выцягваў цвікі з падковаў...
Так мне сорамна было перад Божанькам,
перад Маці Божай Вішнёвай...

І забраў айцец мае болі,
закапаў пад кустамі вязу...
Мне сказаў:
— Не грашы так ніколі болей
і гэтых грахоў
другім ксяндзам не расказвай!
З Богам буду сам дамаўляцца,
каб дараваў
беларускай паганцы...

Зрыфмаваць можна новы верш,
а спачатку жыццё не пачнеш.

## Хрыстос уваскрос

Хрыстос уваскрос!
Праменнем з нябёс
раструшчыў лёд, растапіў мароз.
Лужок памыўся ў возеры слёз,
паплаваў, высах, за ноч падрос!

Прачнуся, выбегу, як звярок —
святлом струменіць святочны змрок,
звініць аднекуль вясны званок.
А дзе ж мароз? А за мора ўцёк!

Трашчыць кляновы ў печы агмень,
прыйшоў смарагдовы Вялікі дзень!
Нібы пісанка, купал нябёс...
Хрыстос уваскрос! Хрыстос уваскрос!

Буду на небе зоркі збіраць,
слоўкі на нітачкі промняў нізаць,
на золку з мамай за родных душ
складаць малітвы хвалебных руж!

Добра з прымурку ў акенца глядзець —
а раптам выйдзе з бору мядзведзь!
Гасцінцам едзе святочны воз —
А Хто ж там едзе?
Хрыстос уваскрос!

Касцёл прыбраны, ідзе Імша!
Выносяць Гостыю з лікам Хрыста!
Церні крывавяць на галаве!
У Эўхарыстыі Хрыстос жыве!

Святочная вулка, сонечная —
хто ў вёсцы шчодры, той і сваяк!
Хто адгавеўся, той і падрос.
Усе спяваюць —
Хрыстос уваскрос!

Звяснею... буду варочацца ў сне...
Мёдзікам мама палечыць мяне.
Не выцірайце шчаслівых слёз...
Вялікі дзень!
Хрыстос уваскрос!!!

## Сёмуха

Сёмы тыдзень
Хрыстовага Змёртвыхпаўстання.
Касцёл у зялёным убранні...

Зоркі ў званочкі звоняць,
перапёлкі купаюцца ў збожжы...
На зямельку сыходзіць
Дух Святы Божы!

Шапоча малітву дождждык
на бярозак цёплыя слёзкі...
Каля веснічак, каля варот,
пры дзвярах і ў куце бярозкі,
выйшлі з лесу — нібы дзяўчаткі,
спыніліся каля хаткі,
ад зямліцы жыцця напіліся,
каля хаткі расці прыняліся,
лек збіраюць жывымі лісткамі,
дыханнем дзеляцца з намі...
Нават зялёнае дрэўца
Богу аддае сваё сэрца...

І цябе ў бярэзнік паслала маці
па зёлкі святыя, бы ў рай, —
акунайся ў зялёнае шчасце,
сунічкаю даспявай...

Зоркі з неба вітаюць Хрыста...
Хвала Табе, добры Божа,
за Радзіму, якую нам даў
і Духам Святым упрыгожыў!

## Божае Цела

Езус Хрыстус у Гостыі
Змяшчаецца ў сонечным крузе.
Узвышаем Цябе, як жаданага Госця,
над залатой Беларуссю!

У вянках з каласкоў і валошкаў
пойдзеш з намі, Божанька мілы...
Нашы збітыя ногі ад Тваіх святых ножкаў
няхай набіраюцца сілы...

Нехта заплача ў натхненні.
Будзем шчыра малітвы спяваць,
хворыя нашы калені
будуць брук святы цалаваць...

Гостыя!
Свае смуткі, цярпенні,
грэх заскарузлы стары
пакладзем перад Госпадам
на ўсе вулічныя алтары...

Вясёлка з душаў людскіх
паўстане ў шчырым зацішку
ад святога Бэрнарда
да святога Францішка...

Нехта з нас памрэ ў гэты дзень
у засені вуліц,
прыняўшы Божае Цела...
Скажуць: «У адчынены рай
душа яго паляцела...»

Езус Хрыстус да Сэрца
жывых і памерлых прытуліць.

Найсвяцейшая Гостыя,
сагнутых жыццём выпроствае,
над узростам, над вёрстамі —
у вышыні Хрыста уваскрослага!

Збаўленчыя промні Гостыі —
гаючыя... не гострыя.

## Мы — Твае падпаскі

Маіх блуканняў светлы пачатак —
па роснай траўцы пасвіла статак,
да цёткі Броні, да бабы Юлі
вядзёркі поўныя неслі рагулі...

Добрую працу ў дзяцінстве мела,
часта са страху, з холаду млела...
На ножках цыпкі, ў кашульцы зрэбнай, —
стамлёная, была ім патрэбнай...

Неяк пастушцы, служцы малой,
цудоўны прысніўся сон:
сядзелі ў куточку пад абразом —
Марыя, Езус і Ён —
Рымскі Папа Ян Павел Другі...
А буслік над лугам выпісваў кругі...

Лашчыў Фаціму вясновы прамень...
Дзяцей з пагорка зямлі
Марыя паклікала пасвіць людзей —
Пасланне яны прынялі.

Паказала ім пекла і брамы нябёс...
Таго, хто сябе ў ахвяру прынёс:
на пляцы Пятровым у сонечны дзень
турак з натоўпу ва ўпор
страляў пасярод людзей —
Папа святы не памёр...

Журавы ахрыплымі галасамі
Курлычуць: «Панна Марыя з намі!»

Вітай, Марыя, поўная ласкі! —
вяночак ружаў ля ног!
Мы — твае пастушкі, падпаскі,
Наш Пастух — міласэрны Бог!

## Фаціма

Дык вось дзе злучаецца неба з зямлёй,
звязаныя хмаркай малой.
Далёка-далёка святая Фаціма,
а ў нас яна перад вачыма.

Прачыстая Панна трымае лілеі,
пташыны Ёй ножкі сагрэлі...
І сонейка цуды ўтварае над намі,
і хмаркі плывуць пад нагамі.

Фаціма!
Люцыя, Францішак, Жасінта...
з прадонняў зямных небяспека.
Прынята супольная наша малітва —
і пекла звалілася ў пекла.

Аб чым дзеці шчыра прасілі,
іх просьбы збыліся прароча,
і вочы Францішка, Жасінты, Люцыі
над светам пранізліва сочаць...

Бо кожны жывы чалавек мае шанец —
трымацца мацней за Ружанец!
Ды як пачаліся, так скончацца войны,
з малітвай сусвет будзе вольным!

А дзеці, Прачыстай Марыі прэм'еры,
вядуць несупынна да веры.
Без веры наш свет утрымаць немагчыма.
Маліся з намі, Фаціма.

## Вітай, Мадонна Фацімы!

Вітай, Мадонна Фацімы!
Табе квітнеюць кусты шыпшыны,
дзікія ружы радзімы!

Малітвы, ружанцы, кветкі...
Ва ўсіх прыгожых старых капліцах —
у вянках Твае статуэткі!

У яснай жывой іпастаці...
На ўсіх алтарыках пад абразамі
Хрыстовай Божае Маці.

Спыняй святлом нашы бітвы!
Матулі вёсачак і мястэчак
Табе ўскладаюць малітвы.

Вяночак спяваюць з болем...
Мы без Цябе — як ягняткі бяз статка.
Не пакідай нас ніколі!

## Маці Божая ў Багданаве...

Ясна Панна на возе на ціхай Каштанцы,
гаспадынька ў хусцінцы на сівой галаве, —
так мне хочацца з вамі, як малой, пакатацца,
нібы ў чарадзейным сне...

Ад Назарэта да святое Фацімы,
Міласэрная Панна, за Табою ішлі мы —
то пад горачку беглі, то праз далочкі,
след у след у святыя траплялі слядочкі...

Ты вітаеш нас — ясная, чыстая,
бы зара-зараніца агністая...
Усміхнута, загадкава-дзіўная,
бы святая горка Аліўная.

А зямелька наша ўрадлівая,
бо вандруеш па ёй Ты, шчаслівая.

А вадзіца наша спажыўная,
бо любоў да Цябе ў нас наіўная.

Ты, як цёплы дожджык, што абтрасае
першыя дажджынкі на Нёман,
мы за Табою па родным краі —
плывем, як плыты за паромам.

Ты, нібы лясная палянка,
дзе выспелі ў траўні суніцы.
Ты, нібы ў цемры маланка,
і першы гром на Грамніцы.

Ты — як водар белай шыпшыны,
як мёдзік спелай маліны,
як вясновы крык жураўліны,
Ты суцішваеш востры боль...

Мы ляцім за Тваім Божым Сынам.
Праз Цябе нас слухае Бог.

## Фацімская малітва

Паміж Фацімай і Рашам,
дзе газ і нафту знаходзяць, —
Радзіма, зямліца наша,
буслы на сухім балоце...
Фаціма, ратуй ад злосці!

Ад неспакою, расчаравання,
роспачы, смутку і страху...
Не пакідай нас на выміранне,
жыўцом не кладзі на плаху.

Унукі, якіх на руках калыхалі,
у белы свет паўцякалі.
Сыны спіліся, здзічэлі дочкі,
ад нас паехалі ў прочкі.

А нам, самотным, куды падзецца?
Фаціма, пусці пагрэцца!
Як адзінокім дажыць да смерці?
Сагрэй нам Камуніяй сэрцы!

Каб зноў не ранілі і так параненых
прышэльцы ў аблíччы звера, —
перамяні нас Хрыстовым Целам,
Яго крывёй і аплаткай белай!

## Унебаўзяцце
## Найсвяцейшай Панны Марыі...

У Гетсіманіі на Аліўнай гары,
у духмяным пракосе на беразе Гаўі —
Анёл Божы з галінкаю пальмы
ранкам з'явіўся да Прачыстае Панны...
Ян і Якуб пры Марыі былі...

Марыя стамлёныя вочы самкнула,
заснула, болю ў сне не адчула...
А пры гэтым...
светлыя хмаркі з усіх канцоў свету
пазбіралі Апосталаў-сведкаў...

Апостал Павел з Цімафеем і Дзіянісіем,
і сямюдзесяццю яшчэ ў хмарках з'явіліся.

Апостал Тамаш прыбывае з Індыі,
шукае Яе магілу,
падняў вочы ўгору —
Марыя з неба маланкамі благаслявіла!

Прырода любоў сваю так праявіла
да Маці Божага Сына —
даспела гародніна і садавіна,
і жытцо-ярына на нівах,
у лесе ягадкі, грыбы, чабарок,
каб елі-пілі ды незнарок
не падалі з голаду...
і духмянае сенца, і кожная зёлка...
і з дванаццаці зорак
над Унебаўзятай вясёлка...

Маці Божае Унебаўзяцце,
для святых нябёс нараджэнне!
Кожнаму дому людскому
спакой і благаслаўленне!

Унебаўзятая, у яснай кароне —
Уладарка зямлі-нябёсаў!
Ты на гербе Менска-сталіцы —
апякуешся нашым лёсам!

Жанчыны святой Беларусі,
Твае адданыя служкі,
каласкі збіраюць і краскі,
яблыкі збіраюць і грушкі,
ды ўпрыгожваюць свае кошыкі
ў шаўковыя стужкі,
упрыгожваюць абразочкі
ў свянцоныя зёлкі
ды загойваюць імі цялесныя
і душэўныя болькі.

Ты — наша лекарка, наша аптэкарка,
наша святое збаўленне!
Праз Цябе мы просім у Бога
нябеснага нараджэння!

## Нараджэнне Найсвяцейшай Панны Марыі

Дзяўчат-анёлкаў сцішаны спеў
з лецейкам у паднябессе ляцеў.
Божа здзіўляе цудамі нас!
І выбірае лагодны час...

Хвалі рачныя гайдалі чаўны,
лісце ў гаях — залатыя званы,
сцеле падножжа вецер скразны,
плёны, загоны, стагі, валуны...

Птушкі збіраюцца ў цёплы край.
Нараджэнне Марыі дае нам рай!

Божа стварыў найцудоўнейшы твор —
вернаму люду на свой узор...

Што спела, на дол звалілася,
у вобразе ясным адбілася.
Сонейка ўжо не гарачае,
Богу за цуд аддзячвае.

Птушкі цішэй ужо ценькаюць,
хваляць дзяўчынку худзенькую.
Хвалу аддаюць Яснай Панне
і бацькам Яўхіму і Ганне
за цудоўнае Нараджэнне,
адданае Богу служэнне...

Ясная, Чыстая, Дзіўная —
бы тая горка Аліўная!
Нарадзілася Панна Марыя,
нарадзіла Божага Сына!

## Малітва да Маці Божай

Маці Божая нашай самоты,
прытулі бяздольных сіротаў
на ўсіх кантынентах зямлі,
каб знявечыць нас не змаглі...

Маці Божая шчырай веры,
нібы грушы страсае вецер,
нібы дзеці з пяску ці з воску,
Ты збіраеш з нас сваё войска...

Маці Божая нашай любові,
нібы жэмчуг з пясчынак мора...
Гэты жэмчуг з нашага болю
толькі Ты супакоіць зможаш...

## У кантэмпляцыі

Прагну ў душы схаваць Цябе, Збаўца,
а самой пад крыжам застацца.

Цярнёвы вянок укладваю так,
каб Тваю галаву не параніў —
каб церняў іголкі
не ўпіваліся ў скроні,
каб даспелі на добрым сонейку
Крыві Тваёй збаўчыя гронкі...

Да Маці Тваёй, Абаронкі,
малюся, аж пакуль не звалюся
стамлёна пад крыж у траву,
прытулюся і ажыву...

Нехта стракоча ў цёплай расе,
дыханнем Духа Святога
мне краплінку жыцця страсае...
Падарунак ад Пана Бога
ў пачатку траўня, ці мая.

## На Я́на

Як на Яна сонейка грала,
ночка не заплюшчвала вейкі,
не змаўкалі ў ноч кароткую на Я́на
галасістыя салавейкі.

Як апоўначы на Купалле
ад Усвят да Крынак было весела:
памаліліся ў Божым храме,
вогнішчам купальскім — сагрэліся.

Як Купалкі заходзілі ў хвалі ракі,
Русалкі дзяўчат казыталі,
як знікалі са знічкамі ў хвалях вянкі,
дзецюкі вяночкі лапалі...

На калок прымацоўвалі кола,
гэта вогнік вясёла сваволіў.
А вянок са слязінак дзявочых
на святы дарожны крыж ускочыў...

Ян Хрысціцель у хрысцільні акунаў,
Яська, тата мой, плыты па Нёмане гнаў...
А Марылька кросенцы снавала
ды слязінкамі перабірала,
Яську з таго свету выклікала...

Хоць купальская ночка кароткая, —
жыццейка і пад старасць салодкае
прыгодамі сваімі нявіннымі,
цудамі, шчаслівымі ўспамінамі.

Не згубіліся мы ў папараць-кветцы,
зоркі нас загартавалі ў крыніцы.
Мы на Яна пачаліся на дасвецці —
Мы няўзнак не знікнем у нябыце...

## Пётр і Павел

Стаяць пад крыжам на гасцінцы старым —
а ўсе гасцінцы вядуць у Рым, —
адпаведна, з ключамі і з мечам, —
з прыладамі, што адчыняюць нябёсы, —
Пётр не павешаны ўніз галавой,
у Паўла галава на плячах,
сонейка над імі з полем сумовіцца
ў вянках з каласкоў і валошкаў...
Павел у сандалях, Пётр босы!

Святыя кароўкі вянкі на рожках
нясуць, і промнейка ў рожках іскрыцца,
і я за кароўкамі збітымі ножкамі
басанож бягу па старым гасцінцы...
Сабраўшы статак, цягнуся дахаты,
да мамы, да таты...

Чаму ж баюся, што не дацягнуся,
за корч зачаплюся, не прыгарнуся...
Хто знойдзе? Няма ў мяне брата...
Згублюся — буду сама вінавата...

А Пётр і Павел
у печах вясковых распаляць,
верашчаку звараць, зоркі патушаць
і знакам крыжа паблагаслаўляць
нас, заблуканых пастушак.

І пойдуць на неба ў спякотны поўдзень.
Бо так ім трэба... А мы не пойдзем.
Мама пры печы скончыць свой танец,
ў натхненні за ўсіх згаворыць Ружанец.

Буду салодка ў цяньку адсыпацца,
нават вушкі схаваю пад коўдру,
каб не чуць, як слоўцы лятуць у прорву.
Такая ў мяне пастушыная праца...

Такая ў мяне вясковая радасць!
Нібы ў Пятра і Паўла.

## Лета з Богам

На прамяністым грабеньчыку Нёмана,
на залатым ружанчыку грому
Нехта з цяплом уваходзіць, бы вецер,
хвалямі, нібы пражэктарам, свеціць.

Дыхае, дыхае, дыхае смела,
пасярод ночы цемра самлела,
сонныя твары расой абмывае,
грэе любоўю, на неба ўздымае.

Сном аднаўляе зямельку-аплатку,
лечыць і туліць нас, занядбаных,
не пабірае ні з кога падаткаў —
Божаю воляй зрывае кайданы.

Шчасцейка вырасці на сенажаці,
кінуцца ў зёлкавы звон з галавою,
плакаць, таму што была ў мяне маці,
верыць: наш Божа з ёй і са мною!

## Анёлак

Бывала, я слоўцы складала,
як хусткі, у некалькі столак.
У клопатах забывала
цябе, мой дружа Анёлак.

Толькі калі пустэча
ў душы маёй, нібы ў місе,
ціха прашу — аб'явіся,
паплач са мною пад вечар!

Або — калі сутыкнуся
Знечаку* з ведзьмай злою,
душа сцякае крывёю,
тады да цябе малюся.

---

* Знечаку — слоўца Ніны Мацяш.

Зямля абкружана небам,
неба вакол зямліцы...
Прышлі мне вестачку з ветрам
ад маёй прыгожай сястрыцы.

Пачуцці думкі мяняюць,
калі паддаюцца практыцы...
А тата з мамай над намі
праз цёплы змрок усміхаюцца.

Лятаеш ад іх да мяне —
невідочны нават у сне,
ні зману, ні крыўды, ні здрады, —
прыносіш светлую радасць.

Буду за крылцы трымацца,
не буду ведзьмаў баяцца.
Светлай любоўю да Бога
навучыш мяне напаўняцца!

Прамчалася навальніца,
пакінула вырай вясёлак.
Засну — магчыма, прысніцца
мой незабыўны Анёлак...

## Вырай анёлаў

Давайце збірацца ў святыя суполкі,
займайце пачэсныя месцы, анёлкі!
Збярэмся — нябёсы штовечар паслухаць,
натхняцца дыханнем высокага духу!

Усе немаўляты растуць, як анёлы,
ды часта іх чэрці хапаюць за полы,
яны, як анёлы — заўжды навасёлы!
Давайце збудуем ім горад вясёлы!

А чэрці не маюць апошняга слова,
бо іх перамога заўжды выпадковая.
І нават, як сэрца згарыць у агні,
чарцей пераможа анёл дабрыні.

## Перамяненне Пана на гары Табор

Зямнога шчасця святая хвіліна —
шчаслівы тата бярэ на рукі малога сына —
сын да шчакі прытуляецца —
птушаня-падлятунчык лёткі...
Тата яго падкідае пад святыя аблокі,
каб паказаць, што іх узаемнай любові
болей, чым таты самога...
Такое імгненне жыцця зямнога
навідавоку ў Бога.

Тут ёсць захапленне да самазнішчэння —
маўляў, мая натура, маё карэнне,
ад прадзеда, дзеда — ў іх нашы гены...
Перамяненне подых імгненны.
Бацькавы рукі падкінуць малога
і прывядуць да Бога.

Так Айцец Бог
на гары Табор
Езуса, Адзінароднага Сына,
перамяніў, у ясноты падкінуў!

Шчасце выпрабавання на вачах у траіх,
у сведкі Боскага цуду абраных —
Езус Хрыстус сам выбраў іх,
Відзежай усхваляваных.

І зразумелі Пётр, Ян і Якуб,
што засведчылі Божы цуд!

## Святыя Францішак і Дамінік

Як сустрэліся ў тысяча дзвесце пятнаццатым
на Латэранскім Саборы,
так сталі сабе і стаяць ад тае пары
ў фарным касцёле ў залатым алтары,
у малітоўным гуморы —
разам
па-за жыццём, па-за часам —
у золаце, у евангелічнай прастоце, убога —

варта Айца, Сына, Духа Святога —
Францішак з баранчыкам, Дамінік з сабачкам,
сабачка трымае ў зубах запалены квачык
і гэтым боскім святлом асвятляе Гародню...

Мы вам удзячныя за натхннне,
за святое між нас аб'яўленне...
Толькі скарбы малітваў трымаем,
дзякуй за тое, што маем:
за восьмае жніўня святога Дамініка,
за чацвёртае кастрычніка святога Францішка,
за Ружанец, стыгматы і псальмы,
за супольныя ў веры трыванні!

## Тры Арханёлы

### *Арханёл Міхал*

Дзідай прабіў тры галавы
цмоку,
у багну шпурнуў усе тры —
Бог Цябе выбраў Князем Зямлі!
У касцёлах шануем Твае алтары!

Як птахай душа вырвецца з цела,
святым агністым кап'ём не ўкалі
маленькую птаху... і так адбалела...
пакуль жа ў целе — няхай баліць.

## *Арханёл Габрыэль*

Праміну́ла сівое стагоддзе.
І натхненне маё — пасцель.
Вершасказ з-пад пяра не выходзіць
пра Цябе, Арханёл Габрыэль.

Арханёле, муж, моцны Богам!
Нейкі выбух грыміць за парогам,
і за сценкамі сварацца людзі,
сонных крыўдзяць, але не будзяць.

Бачыш, як нас нядоля прыгнула,
нейкі д'ябал руйнуе наш край,
то пакуль Беларусь не заснула,
Беларусь за людзей не карай.

Ты прадвеснік Боскіх падзеяў...
Неспакойна ў родным кутку...
Нам зялёную пальму надзеі
пакладзі на зялёным грудку...

Трэба верыць — не ўсё зруйнавана,
шчэ надзеі прамень не пагас.
Верым хросту Хрысціцеля Яна.
Езус Хрыстус вызваліць нас!

## *Арханёл Рафал*

Божы слуга, Арханёл Рафал
служыць загадчыкам Боскай аптэкі —
словы падзякі, просьбаў, пахвал —
кожнай душы наймацнейшыя лекі.

Калі зямелька свой цёплы падол
падсцеле, прытуліць пагоркам мілым, —
не кінь майго сябра, Рафал Арханёл,
ён, як Тобій сляпы з Нінівы.

## **Малітва за тых, па кім мы сумуем**

Душы,
каго мы любілі, па кім сумавалі,
сухімі гасцінцам павандравалі,
паплылі чаўнамі па плыткай Гаўі,
з Нёмана ў мора, як крыгі, расталі,
паляцелі, як бліскавіцы,
як зярняткі пшаніцы,
упалі
на камень, на бор, на пясок,
словам сталі, насеннем,
тымі,
хто пойдзе за імі —
узыходзячым пакаленнем...

Няхай жывуць, узыходзяць
ды зацвітуць неаднойчы
у новым добрым народзе
зялёныя татавы вочы!

## Адвэнт

Мяне прынёс буслік, які застаўся
зімаваць на пустым галлі...
Якраз у снежні адвэнт пачынаўся.
Бацькі мяне прынялі.

Адвэнт — чысты, як першы снег:
Езус народзіцца, добра будзе!
Чаго ж чакаць было ад мяне
спрацаваным вясковым людзям?
У Біскупцах на балоце,
у халодным смутку, ў згрызоце
вясковага нецярпення,
у чаканні Збаўцы з'яўлення...
у прадчуванні спрадвечнага раю...
Жыццё мінае — я ўсё чакаю
Божай ласкі і зразумення...

Кожны колас на Яськавым полі
мне натрос асцючкоў любові,
калі малацілі цапамі...

Адвэнт, Адвэнт...
Жыццё ў чаканні:
Езус народзіцца для Беларусі —
Божа, а я да Цябе тулюся...

## Батлейка

Святую батлейку святы Францішак
выразае з аблокаў-латкаў.
Кліча бяздомных звяркоў і птушак
на ламанне аплатка...

Свяціць стамляюцца нават зоркі,
дрэмле неба стамлёнага колеру.
Чорны хохлік за Дзіцем цікуе з норкі,
але не вылазіць з-пад кораня...

Пахне сенца ў стозе. Рабая свіначка
рохкае мовай людской.
Цуцык Бурык з бору нясе барвіначку,
прыбраную зорнай луской...

Апякун святы Юзаф знайшоў каморку,
запрасіў гаспадыньку-вавёрку —
з арэшкамі аладкі пячэ на алеі
ды корміць Божы Бэтлеем.

Так добра спыніцца ў малітве-сне
ў Святой Сям'і, між радні...
Добры Божанька, прытулі мяне
да любові, да дабрыні!

# РУЖАНЕЦ І КРЫЖОВЫ ШЛЯХ

(прыватныя медытацыі)

# РУЖАНЕЦ

## Радасныя таямніцы

### 1. *Звеставанне*

Вітай, Марыя, поўная ласкі, Ты выбрана Богам!
Арханёл Габрыэль да Марыі пасланы з нябёсаў...
Бог творыць цуд пад Сэрцам выбранай Панны...
Людзі, выходзьце з хатаў сустрэць Звеставанне...

### 2. *Адведзіны святой Альжбеты*

Марыя ў чаканні Сына ідзе да святой Альжбеты...
Альжбета, цяжарная Янам, вітае Марыю светла.
Марыя дапамагае святой Альжбеце па дому...
Людзі, дапамагайце ўзаемна адзін другому!

### 3. *Нараджэнне Езуса Хрыста*

Нарадзіўся наш Збаўца, хор анёлаў спявае гасанну!
Пастушкі, мудрацы на каленях вітаюць Сына і Панну!
Узышла калядная зорка, каб мы падняліся з каленяў.
Збіраймася на пагорках!
На Каляды Збаўцу сустрэнем!

### 4. *Ахвяраванне Хрыста ў святыні*

Святая Марыя і Юзаф прынеслі Дзіця ў святыню.
Стары святар Сімяон высока падняў Малога —
усцешаны, благаслаўляе Збаўцу, Божага Сына...
Вядзіце дзяцей у святыні, узнімайце вочы да Бога!

### 5. *Езуса знаходзяць у святыні*

Езус меў 12 гадоў, калі Маці Яго згубіла.
Ён затрымаўся ў касцёле з вучонымі, дактарамі...
Пакуль молімся на Ружанцы,
ласка Божых вачэй над намі...
Божа, не пакідай нас да новага Звеставання...

## Таямніцы святла

### 1. *Хрост Езуса ў Ярдане*

Хрыстус ахрышчаны ў хвалях святога Ярдана,
мы таксама ахрышчаны Хрысціцелем Янам...
Пакаленне за пакаленнем хвалі святога Ярдана
акунаюць нас і выносяць да Божага акіяна...

### 2. *Езус аб'яўляе сябе на вяселлі ў Кане*

Езус творыць віно з вады па Айца Божай волі.
Глытком адкуплення здымае правіны любові.
Слязьмі адкупляемся, льецца нявінная кроў.
Езус — дарога, жыццё і праўда... для ўсіх нас Любоў!

### 3. *Абвяшчэнне Божага Валадарства*

Перамешваецца, супыняецца, да Хрыста вяртаецца час...
На гары высокай збяры, уздымі, непрытомных, нас...
у пілігрымку, у санктуарый вечнага лета...
у Божае Валадарства з паднявольнага свету!

### 4. *Перамяненне Езуса на гары Табор*

На гары Табор... I ў людзей ёсць такая гара,
Анёле, ў акенца пастукай, калі прыйдзе пара ...
Душа нявінная ў сне запалае ў агменю стос...
Божа, перамяні і прымі да Тваіх нябёс...

### 5. *Устанаўленне Эўхарыстыі*

Такое імгненне празрыстае — Эўхарыстыя...
Сцішыўся люд, дыхаць ажно перастаў:
узнімуць святлінку болю ў нябёсы рукі Хрыста —
белага хлеба крышынку, цудаў святых кроплінку...
Ачышчэнне... агністае... і правінаў амністыя...
Эўхарыстыя...

## Балесныя таямніцы

### 1. *Малітва Езуса ў садзе Аліўным*

Бог Айцец выбірае Сыну Яго пару:
Сын мае сілы данесці крыж на гару...
З крыжам ісці на крыж пад зняважлівы крык,
прайграць, але выйграць бітву без забівання.
Збіраймася, людзі, пад крыж маліцца Ружанец!

### 2. *Бічаванне*

Калі Езуса бічавалі, мы нічога не адчувалі...
Косці нам не балелі, удараў мы не лічылі...
Нікчэмныя — мы драмалі ў дрымоце салодкіх мараў...
Божага Сына бічуюць за нашы нікчэмныя ўчынкі.
Як ахвяру прымайце зямныя бічынкі!

### 3. *Укаранаванне Езуса цернем*

Укаранаваны цярнёвай каронай, будзь пахвалёны!
Твой вечны боль за людзей баліць без канца.
А людзі з ляснога Твайго Івянца —
церпяць і з болем ідуць за Табой да скканчэння,
укаранаваныя цернем прадвызначэння...

### 4. *Езус нясе крыж на гару Кальварыйскую*

Самы цяжкі крыж падняць і несці з Табой на гару!
Не пакідай, добры Божа, калі я пад крыжам памру!
Няхай простыя людзі з Тваім святым Іменем
пад крыжам Тваім стануць мне сувязнымі.
Самы цяжкі Твой крыж разам з Табой падніму!

### 5. *Укрыжаванне і смерць Езуса*

Пакуль што не паміраю — сплю і сню сон,
розныя дзіўныя рэчы мне бачацца ў сне...
Укрыжаваны Сын Божы абяцае шмат светлых дзён!
У старасці, у нямогласці Ты не пакінеш мяне!
Рукі, ногі баляць, іх да крыжа прыбілі цвікі.
Гэта сон ачышчэння. Прыйдзе час — і боль праміне...

## Хвалебныя таямніцы

### 1. *Уваскрасенне Хрыста*

Мы таму і трымаемся тут, што Хрыстос уваскрос...
у няўтульным, бяздольным, нішчымным кутку.
Так сцяжынку з вясёлкі ад рэчкі да возера тку —
слова — уток і аснова... ад слёз да нябёс...

**2.** ***Унебаўшэсце***

Не пакідай нас у высахлай багне на дне!
Не пакідай, пакінутай татам і мамай, мяне...
Унебаўшэсце Хрыстова ўздымае з заўчасных магіл...
Вочы ўзнімайце ў нябёсы — узлятайце за небасхіл!

**3.** ***Спасланне Духа Святога***

Духу Святы! Сена духмянага стог...
Душы тых, каго любім, прыходзяць адтуль, —
слоўцам начным, уздыханнем, куваннем зязюль...
Ветрам, праменнем, Духам Святым дыхае Бог.

**4.** ***Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі***

Божая Маці ўзляцела ў нябёсы з душою і целам,
засталіся жывыя кветкі на зямлі вяночкамі слоў.
Я высока ўзлятаю ў сне, ды падаю ў цемру...
Маці Божая, цемру жыцця асвятляе Твая любоў.

**5.** ***Укаранаванне Найсвяцейшай Панны Марыі***

Дванаццаць цудоўных зорак разліваюць святло,
зоркі Тваёй кароны трымаюць людское зло...
Богам Укаранаваная Уладарка Зямлі,
блякнуць зямныя кароны
            ў кроплі Сына Твайго крыві.

## КРЫЖОВЫ ШЛЯХ

*Разважанні маці*

### Уступ

Езус маліўся ў вялікім смутку адзін…
Ведаў: прыходзіць час прыняць пакутную смерць…
Умацуй маё хворае сэрца, Бог Айцец, Божы Сын!
Навучы за людзей разам з Табой цярпець.

Бывае, у вялікім смутку такое сніцца:
дзеці дома збяруцца, я імі цешыцца буду…
Прашу ў Цябе, Божа, не звышдзівоснага цуду,
толькі б сын атрымаў здароўе
з цярпення Твайго крыніцы…

### Стацыя 1.

***Езус асуджаны на смерць***

Узбуджаны дзікі натоўп Езуса судзіць смялей.
Пілат для свайго спакою аддаў ім Збаўцу на здзек…
Адмаўляцца ад Бога для дробных сваіх прывілей?
Сын мой — апошні калека сярод апошніх калек…

Дрыжу за сына, бы ў полі асінка дрыжыць…
Праз п'янкі яго марную сваю душу.
Шчыра малю сына майго лячыць, —
іншага, лепшага сына, у Езуса не прашу.

**Стацыя 2.**
***Езус бярэ крыж***

Езус абнімецца з крыжам, як з братам жывым.
Крыж панясе на Галготу. Сканае на ім...
Божа! Плачу па-бабску, Ты — змучаны і маўчыш?!
Цягну непрытомнага сына — гэта мой крыж!

Плачу пад крыжам — збянтэжаная, не святая,
Бацька даўно памёр, ці з Богам — не ведаю я...
Ды калі наш сын на дне бутэлькі канае,
то разам з сынавай, п'янай, канае душа мая...

**Стацыя 3.**
***Езус падае першы раз***

Упасці пад крыжам, падняцца і крыж падняць!
Езус першым упадкам нам пакорнымі быць наказаў!
Пакорны, цярплівы, стары беларускі народ
стаіць на каленях пад крыжам чатырыста год...

Ды як жа такім пакорным падняцца з каленяў? —
Баімся, губляем свой гістарычны час ...
Мову-душу губляем, ад страху не маем ценяў...
Езус пад крыжам падае за ўсіх нас!

**Стацыя 4.**
***Езус сустракае сваю Маці***

Стала Марыя з прабітым Матчыным Сэрцам.
Стомленымі вачамі Езус Маці вітае.
Мой сын шукае адхлання толькі ў бутэльцы.
Прабач нам, такім нікчэмным, Марыя Святая...

Сорамна мне, ды нястомна малюся аб гэтым,
каб не знаходзілі п'яных, замерзлых, зімой,
спечаных на сонцаспёку гарачым летам, —
з залежнымі ад бутэлькі сябруе сын мой...

**Стацыя 5.**
***Сымон Кірынэец дапамагае Езусу несці крыж***

Сымон Кірынэец пакінуў коней і плуг.
Крыж на Галготу з Езусам цягнуць удвух.
Кленчу ў касцёле між верных, нібы адна...
Баліць, сціскаецца сэрца, а Сымона няма.

Пастарэлі мае сябры, паехалі — хто куды...
Як захварэю, хто ж мне падасць вады?
З кім мне слоўцам абмовіцца, абмяняцца слязой?
На ружанчыку з коцяй малюся пад абразом...

**Стацыя 6.**
***Вераніка выцірае твар Езуса***

Выцерла Езусу пот Вераніка хусцінкай звычайнай
на відавоку ў п'яных акупантаў-салдат...
Езус упаў пад крыжам, штурхануў яго кат ...
Сын мой жыве з жанчынай, бутэлькай звянчаны.

Ён хістаецца, падае, нібы калека,
і не спрабуе падняцца на поўны рост,
перад крыжам укленчыць, вочы падняць да неба,
папрасіць прабачэння ў Езуса ў Вялікі пост...

**Стацыя 7.**
***Езус падае другі раз***

Езус з крыжам на камень падае другі раз —
другі раз збівае калені, збаўляючы нас...
Знясілены сын заснуў. Гэта ўсё праз мяне —
мае правіны мучаць п'янага сына ў сне?!..

Калі мы з табой засталіся без бацькі адны,
ты з працы вяртаўся, я чакала цябе, як з вайны...
Праз п'янку страціў сталярку, нешчаслівы, ляжыш?!
Унутры твайго хворага сэрца драўляны твой крыж!

**Стацыя 8.**
***Езус суцяшае ерузалемскіх жанчын***

Езус сказаў жанчынам: «Вы за сваіх сыноў
плачце, чаму яны не знаёмы са Мной?!»
Сын — калі спіць, спакойны, нібы малы...
Укрыжаваны Сын Божы, схіліся над ім...

Нездарма ж белы буслік з высокіх нябёс
на прадаўжэнне роду мне сыночка прынёс
з прыгожай, чыстай, такой наіўнай душой,
каб ратаваў Тваіх птахаў, звяроў, паўзуноў, вужоў...

**Стацыя 9.**
***Езус падае трэці раз***

Трэці раз падаеш з крыжам, Езус, Боžанька мой!
Цела скалечыў — сыну майму дапамог...
Збірайцеся ў маё сэрца, калекі, мне вас шкада!
Езус за вас сканаў, на трэці дзень Змёртвыхустаў.

Вяртаецца сын, як зямелька пасля дажджу.
П'яны, як голы... Прапіў у карчме душу.
Голаму сорамна, п'яны ляжыць у гразі...
Апраніся ў малітву — прабачэння ў Бога прасі!

**Стацыя 10.**
***З Езуса здзіраюць адзенне***

Якія ёсць здзекі, азвярэлы натоўп перабраў,
у самым нялюдскім здзеку з Езуса шаты сарваў!..
Так бандыты звярэюць ад бясконцай вайны...
Думаюць — замест Бога светам правяць яны.

А на зямлі нашай войны пачынаюцца зноў,
забіваюць, ламаюць косці, калечаць сыноў...
Уставай, мой сын, абмывайся гаючай вадой —
на зямлі нашай людзі звязаны доляй адной...

**Стацыя 11.**
***Укрыжаванне Езуса***

Божае Цела, нібы крывавая рана,
прыбіта да крыжа цвікамі, укрыжавана —
з крыжам Сын Божы над грэхам людзей узняты...
Трэцяе тысячагоддзе крыжуюць невінаватых.

Трэцяе тысячагоддзе не канчаецца гэта вайна...
Цяпер у нашых суседзяў нянавісць не мае дна.
Хітрыя ворагі-д'яблы дабро замешваюць злом,
Да крыжа людзей прыбіваюць услед за Хрыстом.

**Стацыя 12.**
***Езус памірае на крыжы***

Езус апошнім парывам да Бога ўзнімае вочы —
святое жыццё аддае на Божую волю...
Самотная, ты баішся сынавай смерці духовай?
Так, гэты сынаў грэх мучыць мяне найболей...

Маці дзяцей пахаваюць, губляюць розум,
з гора выплакваюць святло вачэй са слязьмі.
Маці Святая пад крыжам з Сынам канае разам —
Дапамагае падняць нашых сыноў з гразі.

**Стацыя 13.**
***Езуса здымаюць з крыжа***

Жанчыне самотнай уяўляецца гэта дрэнна,
як прыбіваюць і як здымаюць з крыжовага дрэва...
Як на каленях Маці Сына люляе зноў —
на адкупленне грахоў блудных сыноў...

Бывае, грэшныя людзі лічаць сябе святымі...
Людзі не кажуць праўды, калі іх збіраецца ўтрох...
Але Ты, Хто смерць перамог, змілуйся над імі!
Прабач і прымі зблуканых, усемагутны Бог!

## Стацыя 14.
### *Езуса кладуць у грабніцу*

У Вялікую пятніцу
перад Вялікай нядзеляй:
Сын Божы звычайны парадак жыцця нарушыў.
Грабніца Яго стала месцам нашай надзеі,
Санктуарыем бессмяротных, збаўленых душаў.

З надзеяй пад Крыжам Хрыстовым,
самотныя, кленчым,
з вялікай верай молімся за сыноў:
хворых, пабітых, знявечаных, пакалечаных,
няхай усіх адагрэе Хрыстова Любоў!

## Заключная малітва

Так, мы паднімем крыж і збярэмся ў Фаціме.
Памолімся на пагорках выбранай Маці-Радзіме.
Укленчым прад Божым Сынам там, на аддалі,
адмолім сваю Айчыну, якую так занядбалі...

Малітвай шчырай залечым грахоўныя раны...
Пакаемся перад Табою, наш Збаўца ўкрыжаваны.
Ясная Панна з'явіцца нам, як выбраным дзецям,
і сагрэе людзей Яе Беззаганнае Сэрца. Амэн.

# ЕДЗЕ-ЕДЗЕ
# НА САНАЧКАХ
# СВЯТЫ МІКАЛАЙ

## Пакідаю вам кветкі

На папялішчы спаленай хаты
паразмаўляла з мамай і з татам —
мае нябесныя адвакаты.

Каля парога куст брызгліны застаўся,
ёсць дзе схавацца душам і птахам.

Пахадзіла па вёсачцы воблачным ценем,
напілася ў цётчынай студні піцення —
Бога маўчання,
выцерла з вуснаў святлінкі надзеі —
і да спаткання...

Госць нечаканы ў шчаслівым сюжэце,
над галавой парасон, вольны вецер.

Мой белы свет, няўтульны, вялікі.
Зялёныя конікі, гнёзды ў траве,
слонкі, рамонкі, валошкі, музыкі...
тут памяняецца ўсё без мяне.

Хворыя сёстры, боль гэты востры...
на скрыжаваннях бусліныя гнёзды.
У шчасці наплакалася, пагасціла...
Дзякуй, мая залатая радзіма!

Як табе ў гэткім спакоі спаліцца
выпала доля, зяць мой Сярожа?
Горка мне плакаць і горка маліцца...
Дапамагай нам адтуль, калі можаш.

## Вечаровы смутак

Лепш не вяртацца ў пусты закутак
збіраць вечаровы смутак.

Іржышча злое направа, налева,
пацямнела самотнае дрэва.
Вецер крылаты
кружыць ля хаты,
хата згарэла, толькі быльнёг
на папялішчы не ссох...

Бачыш або ўяўляеш,
як сіраціна малая,
каласкі па пожні збірае,
Езуса з неба кліча —
запэцканае аблічча,
але не мае цярпення,
каб дачакацца да наступлення
ўсяму збаўлення-цямна.
У чыстым полі адна...

Чаму адна?
А перапёлкі,
а месячык і анёлкі?
А зоркі-званочкі на дрэве?
Цямна баяцца не трэба
на папялішчы спаленай хаты,
з духамі Эрыка, мамы і таты...

Дзе вы цяпер, па-за светамі,
ва ўспамінах, у светлым сне...
Разгубіліся перад «саветамі»
і здалі «саветам» мяне.

А Міхал Арханёл, добры Княжа,
у Якога было столькі спраў,
Ён мяне, як прапажу, заўважыў,
прытуліў, ад «саветаў» забраў...

## Вецер

Вецер з усіх старон
у Нёман страсае звон.
Са звонам страсаецца час
у Нёман... Гэта пра нас.

Вецер віхуру родзіць
на агародзе.
Імчыць на прастору ў згодзе,
горад злучае з полем,
дражніцца з голым голлем.

На старажытнай вузенькай
вуліцы
танычыць пад музыку.
Дудачкі вецер не мае,
музыка ў ветру чужая,
украдзеная, перакупленая,
з чужых вятроў пералупленая...

Вецер свішча, правады гудуць,
птушанятам спаць не даюць...
У завулку рыпяць тармазы.
Вецер, Нёман і дзве казы
на прывязі каля Каложы...
Ніхто козаў адвязаць не можа?
З правага на левы плыве
Нехта з ветрам у галаве...

Так трымаемся адно аднаго —
Ён — за вецер, я — за Яго.
Вецер самотна свішча,
аплаквае папялішча,
маю зялёную мятку
нішчыць
штодзень — па зярнятку...

## Тры сакалікі

*Унукам*

Паляцелі мае сакалікі
высока за воблакі —
адзін на захад, другі яшчэ далей,
шукаючы лепшай долі.

Трэці кажа:
— Не хочацца мне
долі шукаць на чужой старане
за морамі, за гарамі,
добра мне тутака, з вамі...

Пакуль мае саколікі на заробках,
іх жыццё бачу толькі на фотках.
Любуюся імі, у Радзіму ўлюбёнымі,
не ведаю пра іхнія планы і плёны:
якую яны там работку робяць,
хто іх любіць, каго яны любяць.
Калі наведваюць родны закутак,
прывозяць мне светлы смутак.

Смутак вочы не росіць
таму, хто яго прыносіць.
Смутак сэрца з'ядае
таму, хто яго прымае.

Рэальны час не рэальны для нас.
Часу простая лінія —
гэта пясчаны гасцінец,
па якім мы з Падласкай хадзілі...
Мае саколікі паляцелі за воблакі.
Мы не жывем адным часам.
Жыць адным часам
можна толькі ў адным месцы і разам...

Саколік, які за воблакі не лятае,
таксама часу не мае,
заходзіць зрэдку, нібы ў разведку,
гарбаткі глыне набягу:
— Ну, усё, — працаваць бягу!
Не сумуй, з табой Божы свет.
Тэлефануй, як «згубіцца» інтэрнэт.

## Мама, тата і я — вінавата

Кроцік спаліўся ці ў спячку залёг?
На папялішчы дзічэе быльнёг.
Вострая зорка скацілася з бору,
дыму дыхнула і падае ўгору.

Тата пайшоў. За ім пойдзе хата.
Хата пайшла аблачынкай над лесам.
Буслік высока, не вінаваты...
Кажуць, што хаты падпальваюць лісы.

Мама спыніла аўтобус і выйшла.
Мама была да неба найбліжша.
У спадчыну ўнукам пакінулі вершы,
выраі ветру... Белую вежу.

У цесным пакоі сцены пустыя,
толькі чародка метафараў стыне.
Што падзялілася, словам не злучыш,
толькі нястомнае сэрца замучыш.

Толькі слязьмі свае вочы заслепіш.
З попелу новыя жыцці не злепіш.
Боль адбалеў, а ты яшчэ церпіш.
Хлеў ацалеў.
А хацелі — як лепей...

Ах, мае сонейкі, мама і тата!
Вы пачалі — я між вас вінавата.
Грэлі сабой у гняздзечку пасцелі,
бо пачалі, а нібы не хацелі.

## Сяброўцы Элі — на ўсе падзеі

Эля, нас Бог не пакрыўдзіў!
Мы ў дзявоцтве вучыліся ў Лідзе,
у прыгожым палацы — прасторныя класы —
нашы настаўнікі не шкадавалі нам часу:
вопыты нам паказвалі па фізіцы ды па хіміі,
хімічка хімічыла, мы колбачкі вымылі...
Музыку слухалі разам вольнай хвілінай,
хорам спявалі, настаўнікі нас хвалілі.
Аднойчы ўскрывалі жывоцік прыгожай жабцы...
Вучыліся йграць на скрыпцы, на балалайцы.

А як танцавалі пасля заняткаў пад ліпкамі!
А на экзаменах нямымі «плавалі» рыбкамі.
Экзамен пераздавалі праз некалькі дзён!
Зубрэнне мела свой плён.

Лёс раскідаў — мяне на захад,
цябе ў супрацьлеглы бок.
Так жыццё праляцела, як адзін цікавы ўрок.

Цяпер пра тое, як мы сустрэліся, Эля!
На 7. 07. 2007... выпадала нядзеля...
Тры сямёркі стварылі дзіўнае дзіва:
я прыехала ў Воранава з карэспандэнтам,
цябе запрасіў рэзчык па дрэве Казік...
Ніхто нікому не гаварыў кампліментаў,
ніхто да нікога ў душу не ўлазіў...

Але ціхай размовы ў майстроўні было замала.
Ты запрасіла ў хату, шчыра гасцей частавала!
Было піцення, ядзення і нават прымусу!
Так прымае гасцей сталы народ — беларусы!

На развітанне ты назбірала з градкі —
бы ў чарадзейнай казцы, шмат рознай прынадкі...
І мяшэчак грэчкі... Ну, мілая Эля!
Хто яшчэ гэтак грэчку на крупкі памеле?

Паўтаруся: у Беларусі гасцей частаваць умелі.
Цяпер такая гасціна засталася, хіба што ў Элі.

Гэтым прыгожым летам нам зноў неабходна —
сустрэцца на мосце святога Францішка ў Гродна.
Мы яшчэ зможам дайсці да святой Каложы...
у тонях Нёмана зорак наловім у кошык.
Начаваць затрымаемся там, дзе прасторная хата.
Мы ведаем, Эля:
сяброўства — гэта і ёсць свята!

## Настальгія па драўляным доме

Сэрца сціснецца — ў поўначкі выйду,
напрасткі ў старажытную Ліду
пабягу праз сухое балота —
як была, так і ёсць — наіўнота,

У Лідзе стаяў дом драўляны.
У гэтым доме жыла сям'я.

Да іх прыбілася неяк і я,
дзякуючы Марысі і Франі.

Там дабрыня панавала без межаў,
Там Магдалена замольвала ежу.
Быў пакой адгароджаны крэдансам,
у ім, нібы ў норцы, мы грэліся...

Нашу пані наведваў ксёндз,
нас благаслаўляў перад сном.
Кніжкі мудрыя пані чытала,
нясушка ў хляўку сакатала.

А худая рабая свіначка
каля студні ў карытцы мылася.
Там і цуцык жыў, усіх нас любіў,
як жа ён называўся, забылася...

А на поплаве каля Лідзейкі
калыхалі вясну салавейкі.
А Ліда, як добрая мама,
выпраўляла нас на экзамен.

Гаспадыня святая наша
спыніцца, бывала, ды скажа:
— Ты ўмееш вершы складаць?
Жыць трэба з Богам, прыгожа,
каб талент не марнаваць
на грэшныя справы, на грошы.

Каб дрэнчылі нас не вельмі
на экзаменах у вучэльні,
у нядзелькі ды на ўрачыстасцях
мы таемна на хорах маліліся.

Толькі дом прасторны, драўляны,
там застаўся не зруйнаваны...
Толькі Божанька памятае,
як у Лідзе мы падрасталі!

## У Вішневе

Усміхаецца сонца. Світанне...
Гэта ў Вішневе творыцца цуд.
Тут святар беларускі літанію
адмаўляе адзін за ўвесь люд.

Ўжо смяротны прысуд падпісаны.
Проста знікнуць у цемры нам час.
Але нітачкай з небам звязаны
наш святар і трымае ўсіх нас.

Ні багацця, ні славы, ні мовы,
да апошняе кропкі дайшлі.
І не цямяць без веры галовы,
што без мовы народ — без душы...

Але ўзняў Беларусь добры ксёнжа
на свой крыж і да Бога узнёс.
І забраў святара добры Божа
ў Дзень, калі нарадзіўся Хрыстос.

Разагналіся цёмныя хмары,
гром з дажджом патушылі пажар...
Места Вішнева — наш санктуарый,
Беларусі жывая душа.

## Святому Яну Паўлу II у дзень развітання

Якім Ты быў добрым — святлела прастора!
Паплыў Твой чаўнок у спрадвечнае мора.

На чорнай зямлі чорных воранаў зграя,
а ў дзюбах крывавых тры кулі трымае.
Трынаццаты траўня. Ты, Пётр, як скала.
Так блізка ад сэрца ляцела страла...

Ты, Ойча, ўсіх бачыў, бо сэрцам глядзеў.
Паляк — беларусаў Ты меў за людзей.
Ты — Майстар вялікі святога радка,
у вечных струменях натхненне шукаў.

Спытае дзяўчынка з цікаўнасцю свойскай:
— Ты любіш дзяўчынку з заплеценай коскай?
— Люблю ўсіх дзяўчынак — з кудзелькай і з коскай,
апекі ўсім дзецям прашу ў Маці Боскай.

...Сюды, дзе сагрэты любоўю паляны,
нібы да дзяцей роднай Маці-зямлі,
Пан Бог пасылае святых і абраных,
каб мы бессмяротнікам цёплым цвілі...

З нябёсаў зямелька святлее іначай.
Для душаў і сонца зусім не гарача.
А той  кіпарыс — ён засохнуў ад слёз.
А пляц гэты — ключ у праёме нябёс.

## Кардыналу Казіміру Свёнтку

Яго няволілі,
далёка адвозілі,
потым сам ён па свеце
нахадзіўся, наездзіўся.

Айчына ў Бога на ўсіх адна.
З сабою меў крыж,
хлеба крышэнь, кроплю віна
і Прачыстую Ружу,
якая ў неба вяртае душы.

Хадзіў праз мора людское
заўсёды з любоўю,
крыж уздымаў высока
над галавою,

над людскімі галовамі;
хлебам дзяліўся з галоднымі:
каму хлеб удзяляў —
такі меў «пароль»:
— Цела Хрыста...
Найцяжэйшы крыж, моцны боль
цярпеў — невыносны...

згарэў...
І гарыць промень Гостыі.

Калі мы ў Бога пры ім,
пры Кардынале сваім, —
то і тут, на зямлі, мы моцна стаім.

## Ксёндз Адам Станкевіч

*Ён у буру і нягоду*
*родны сцяг і крыж трымаў,*
*беларускаму народу*
*праўду словам засяваў...*

Надпіс на помніку

Каб цвілі тут яблынькі ў садзе,
нехта выбіў на камені верш.
Спіць пад каменем толькі маці.
Сын згубіўся між кніг і папер.

З Божай волі ён крыж вольны нёс,
узнімаў Беларусь да нябёс.
Прапаведаваў бальшавікам,
а гэта страшней, чым галодным ваўкам.

Прысудзілі, што ён японскі шпіён.
У палоне не вытрываў ксёндз.
Цераз смерць, як праз плот, уцёк —
беларускі святы прарок.

Не шукайце яго ў Тайшэце,
ён вярнуўся па зорках дамоў —
з сэрцам, прабітым па смерці,
з пакалечанай галавой.

## Ксяндзу Ігару Лашуку на 50-годдзе

Ойча Ігарку! Добра, што ойча вярнуўся
да Беларусі, нашай Радзімы.
Мы тут зрэдзь часу бываем у скрусе,
гэта прывычка ў нас без прычыны.

Добра, што Ваша дарога з Варшавы
праз еўрапейскае Гродна ляжала.
З Рыма маглі Вы праз Гродна вяртацца,
з Папскім Паслом каля нас затрымацца.

Вы — наш Айцец. Вам вядома найлепей,
як Беларусі падняцца з каленяў.
Вы ж ад Хрыста атрымалі заданне
і ўзнагароду за службу — Багданава.

Вы паўстагоддзя тут не драмалі...
Столькі парафій жывых заснавалі!
Столькі касцёлаў святых вакол Мінска!
Мы перад Вамі схіляемся нізка!

*29 сакавіка 2016 г.*

## Ксёндз Юры Ёдзік

Ксёндз Юры Ёдзік
улятае ў касцёл, як святы самалёцік.

Эўхарыстыю творыць натхнёна, на ўздыме —
і мы адчуваем сябе маладымі.

Усміхаецца прыгожымі вуснамі —
як у Казіміра Сваяка, свайго прадзеда.
З намі, як з вечнымі вучнямі,
дзеліцца Хрыстовай радасцю,
дзеліцца чыстаю вераю.

Удзяляць Камунію бяжыць ад дзвярэй —
насустрач Францішку Ксавэрыю.

Знакам крыжа благаслаўляе
прыціхлых малых па дарозе,
усміхаецца, усміхаецца,
зрэдку малечу ўшчыпне за носік.

І раптам сеў у святы самалёцік
ды прызямліўся ў Цудзенішках, —
ксёнз Юры Ёдзік, сам, нібы зямны цуд.

У Чысты чацвер
з той жа чыстай усмешкай
ксёндз Юры з'явіцца тут.

## Біскупу Алегу Буткевічу з удзячнасцю за рэкалекцыі

Калі маё сэрца зусім знябожала,
а не маю з кім паехаць... у Грэцыю,
тады і прыслаў у наш край добры Божанька
з Віцебска біскупа на рэкалекцыі.

Такі прыгожы наш Эксцэленцыя!
А мова, як чысты ручай ліецца...
Не марай пра містычную Грэцыю —
малітвай сваё супакоіла сэрца...

Святы, малады, намолены біскуп
з мысляў драсён з наіўнотай выскуб,
істоту маю, як лісток асенні,
зернейкам чыстых думак засеяў...

Збіралася ўжо на бязлюдныя выспы
ад затаптанай грахамі краіны,
але паслухала Вас, мілы біскуп, —
чаканнем свята бягуць хвіліны...

Вучыце нас радасці, біскуп Алег,
нявіннасці, нібы дзіцячы смех...
Нясіце Божы крыж, не стамляйцеся!
За Беларусь нашу з намі ўсміхайцеся!

## Ксяндзу Мікалаю Ціхановічу

Калі ксёндз Мікалай быў хлопцам малым,
ён катаўся ў Юрацішках з горкі, як з неба,
патаемна прыносіў — што каму было трэба:
каму — скрылік надзеі, каму — пасталы,
каму — падарункі, ад анёлаў малюнкі,
саначкі-самакаты, залатыя дукаты...

Калі ж у бацькоў падрасталі дзяўчаты,
дзяўчаты на досвітку мроілі замуж,
то ксяндзу Уладзіславу адбіваў тэлеграму,
каб прысылаў у Юрацішкі ў сваты
з Вішнева хлопцаў, верай багатых...

Бо ў Вішневе ёсць беларускі касцёл,
там ксёндз беларускі вучыў не здавацца,
спакойна душой за малітву трымацца,
і пакуль не адмоліш грахоўную пыху,
малітва душу дасканаліць пацiху...

Нават калі табе рот затыкаюць,
а ты думай, як думаў, маўчы — не маўчы:
ды зямліца ад неба не зможа ўцячы!
А людзі ад ксёндза ратунку чакаюць!

У Вішневе Мікалая хрысцілі...
Як ксёндз у хрысцільні яго акунуў,
малы Мікалай акунуўся ў Радзіме, —
так Бога й Радзіму не падмануў...

Так і пайшоў ад мяжы да мяжы
Пану Езусу і Беларусі служыць.

Ішлося часамі то скокам, то бокам...
У сорак гадоў апынуўся ў Глыбокім...
А як апынуўся, глыбей акунуўся
ў бяздонне нябёс над святой Беларуссю...

Ці памятаеце, ксёндз Мікалай,
калі ад'язджалі ў Варшаву вучыцца,
Вы загадалі мне: «Не памірай!»
Але як ад грахоў заскарузлых лячыцца?

Вы ў Варшаве здавалі на святасць экзамен!
Найвышэйшага кшталту цяпер казнадзей...
Сустракаеце свой малады юбілей...
А Касцёл Беларусі Богу дзякуе з Вамі...

Няхай плённа квітнее Ваш травень высокі!
За шляхамі глыбокімі ў старажытным Глыбокім!
Хто імкнецца да Бога, той дарог не мыляе!
З юбілем віншуем ксяндза Мікалая!

*2016 г.*

## Замест белых півоняў на развітанне ксяндзу Яну Шуткевічу

О, Езус Хрыстус, будзь пахвалёны!
Першая споведзь хлопцаў, дзяўчатак.
Па ўсім нашым краі цвітуць півоні —
Лета пачатак.

Можна не есці, толькі надыхацца
паветрам родным...
А ксёндз Ян Шуткевіч ў труне вярнуўся
з Вільні ў Гародню.

Паміж Гародняй, Менскам і Вільняй —
высокі крыж надмагільны.

Падпілавалі, як дуб грымотны.
Над крыжам ясных зорак салют.
Якія хлопцы раслі ў Гародні
падчас маёй маладосці тут!

На дзірванах Вялікага Княства,
у рытмах бязбожніцтва і паганства
меў талентаў, мог быць музыка, разьбяр,
ды Езус на службу святую забраў.

Споўніў ён Божае прадвызначэнне,
святыняў і душ людскіх адраджэнне.
Няўтульна ў савецкім Мінску маліцца —
у старажытную нашу сталіцу
з'ехаў... і там спачыў бы на Росах,
каб не матулін крыж гэты родны.

Святога лета звон шматгалосы...
Ксёндз Ян вярнуўся ў Гародню.

*4 чэрвеня 2017 г.*

## Светлы ўспамін пра Янку Брыля

Асілка з Загора пяшчотна клікалі Янка.
Прыгожы, сонечны, цёплы, сунічак палянка...

Спакойны, ветлівы, пазачасовы,
рыцар, узброены словам,
усяленскай любові віцязь.
Сустракалі ў Гародні яго ў захапленні...
Прывозіў сябрам у сонечнай жмені
з Карэліч крынічную Свіцязь...

Спакойна прымаў гэты край,
вызваляў, вандраваў без спешкі,
праменне яго збіраў, упрыгожваў усмешкай, —
волат, асілак з дабрынёй немаўляці.
Гарнуліся да Брыля, як да мудрага бацькі...

Усе жанчыны хаваліся за яго плечы,
раўнавалі яго да паэтак наіўных...
Ён туліў сваю Беларусь, як малечу,
вучыў, як людзі з людзьмі сумаўляцца павінны...

Жанчыны на досвітку і цяперачы мараць
пра шчасце, пра свята, пра цудаў з'яўленне,
як Янка-асілак жменяй чэрпае ў Шчары
сонечнае праменне...

Ды не пашлеш ні аўтобус, ні аўтамабіль —
не прыедзе ў Гародню ніколі больш Янка Брыль.
Адно застаецца — раней за сонейка ўстаць,
памаліцца ды кнігу Брыля пачытаць...

*4 жніўня 2017 г.*

## Воронік

З нябёс ліў дождждык, нібы з вядзёрка,
змяла віхура з гнязда варонку.
Суседка яе нагой падкідала,
дык я пташыну дамоў забрала.

Прыселі з ёй на драўляны ўслонік —
такія шэрыя дзве варонкі,
пяшчотна кажу ёй: «Мілы Варонік,
чаму ты самы прыгожы і родны?»

Варонік таксама мне ціха кажа:
«Гэта нічога, што я — прапажа.
Я маю кіпцікі, дзюбу-заточку,
з табой і з зайцам — не ў адзіночку!»

Калі распа́ліць язык суседкі
за акном сусветны пажар,
Варонік скокне на табурэтку,
рашуча скажа — кар, кар!

Мой ты Варонік, шэрае сонейка,
здзічэласць і прыгажосць.
Ніколі ў мяне не было Вароніка.
А цяпер Варонік у мяне ёсць.

## Вясковы верш

Некалі вёскі вачамі на вулкі глядзелі,
на падворак падмецены адчыняліся дзверы,
калі белы снег засыпаў хаціны да стрэх,
расчышчалі тунэль шторанку...
А цяпер на акно нацягнулі фіранку,
не прадзецца жыццця калаўрот,
цвікамі забітыя дзверы
адчыняюцца на агарод,
ніхто не бярэцца за клямку...
і кругом ні душы...
да шашы.

Хто тут болей чужы?
хто ненавідзіць, той болей чужы,
чым той, каго ненавідзіць?
Чужы той, хто свой,
хто жар-птушку, Радзіму,
крыўдзіць.

Некалі мамы акно адчынялі
насустрач хмарцы,
дожджык прасілі над ніўкаю затрымацца,
клікалі птушак з бяроз,
каб кроплі страсалі з нябёс,
пацалункамі зёлкам лясным
аддавалі водар і смак —
некалі тут было так...

Словаў чароўныя хвалі
пустэчу ў душы запаўнялі...
а залатыя пчолкі
з мёдзіку слоўкі складалі...
на роднай мове вясну гукалі
шпачкі, жаўрукі, салоўкі.

І куды яны ўсе паўцякалі?

## Беларусь — дзяўчынка

Беларусь — дзяўчынка-падлетак,
не сляпі слязьмі свае вочы,
упрыгож імшалкай палетак
ды засні, пакуль естачкі хочаш.

Затапчы ды забудзь свае страхі,
ды няхай яны курчацца ў змроку,
панясуць цябе мроі, як птахі,
так сама сябе ўбачыш звысоку:

добрым зернем засееш загоны,
шанаваць цябе будуць народы,
ускладуць твае ўнукі карону
на сівую галоўку свабоды.

## У родным краі

Тут, у лесе, ў родным краі,
не баімся воўчай зграі!
Злая сіла. Кыш у мох!
З намі Нёман. З намі Бог!

Сорам думаць — хата з краю...
Трэба ўмерці — паўміраем
за парог свой, за народ —
Захлынецца ў багне чорт.

## У вёсачцы соннай

У вёсачцы соннай, дзе ноччу і днём
людзі стамлёна спяць ціхім сном,
нават нястомны ветрык прыціх,
нават сарокі не сварацца ўслых...

Хаты таксама спяць ціхім сном,
дзеці не плачуць ні ноччу, ні днём...
Комін забыўся, што грэў яго дым,
у поўнач нячысцік скуголіць у ім.

Ветрык вільчак абняў і заснуў,
комін снапочкам валошкаў заткнуў.
птаха малая звіла там гняздо,
песні пяе, ды не чуе ніхто.

Позна, ды можна пачаць ад пачатку —
перапісаць жыццё, як нататку.
А можна скласці чысты лісток
ды запусціць самалёцік у змрок.

## Дубы святога Мікалая

Староста гарадзенскі Антоні
на вуліцы цудатворцы
ля царквы святога Мікалая,
калі царква паўставала,
пасадзіў два дубы,
каб віталі, благаслаўлялі
вандроўнікаў і абаронцаў
Вялікага Княства Літвы.

Чубамі трымаюць неба,
карэннем зямлю ўмацавалі,
перапляліся крывымі сукамі,
сапраўдны цуд — яны самі.

Але гэтым, якія кіруюць светам,
хочацца іх спілаваць,
бо, надта моцна абняўшыся,
надта моцна маўчаць.

Не гнуцца туды-сюды.
Рассыпаюць свае жалуды.
Не скідаюць да новых лісты.

Не баяцца ніякай жуды —
ні залевы, ні духаты,
ані засухі, ані вайны —
волаты, асілкі, сыны
сваёй адзінай зямлі,
на якой магутна ўзраслі,
у горадзе, у якім
каля іх жыццё пражылі
дойліды, кавалі-мастакі,
воіны, купцы, жабракі,
канцлеры ды каралі,
каралевы ды дзецюкі...

Два дубы, як два галубы.
Прытулюся да іх кары.
Яны тут уладары —
чатыры стагоддзі ці тры.

Ды новыя будаўнікі
тут расклалі сваё дабро.
Лезуць да іх у нутро,
знішчаюць карэнне дубоў —
смокчуць магутную кроў.

Цудатворца святы Мікалай,
дай ім нябеснай моцы,
няхай не засохнуць нашы дубы —
драўляныя цудатворцы!

## Верш са старога сшытка

Восень. Водар грыбны ў прасторы.
Пад парасонам хмаркі не схавацца ў разоры.
Кладачка ў свет без парэнчаў,
куляюся ў лямант.
Туман, туман спавівае, як мама.

На дажынкі
мама завязвае жменю
недажатага жыта
над свянцонай скарынкай,
абкладзенай зорным каменнем...

Кармлю цябе, мама, малітвай,
а ў небе начным — калаўротак
на месяц намотвае ніткі.

Коцік Басік, філосаф,
зялёныя вочы прыжмурыў,
памуркаў, падумаў, заснуў...

Крушня. Каменне.
Несмяротнасць памерла.

Нехта па Нёмане ходзіць уніз галавою.
Нёман і жвір сумаўляюцца між сабою.
Ні нябёсаў, ні краю землятрус не карае.
Цень ад прывіду зорачкі у прыску збірае...

На вачах у каменнай Ажэшкі —
Гараднічанка канае.
Душа рачулкі ў хмаркі
пераліваецца,
качка ў балоце купаецца,
уздыхаюць аблокі, хаваюцца ў змрокі...

Калі вырываюць сілком тваю справу,
абыходзішся рэплікай
на выпадковым падворку...

Прывід балота ў зялёным імшары.
Каменне пагрызла дарогу.
Холад сціскае сэрца, бы камень,
праз балота — дахаты...нагамі.

Андрэйка пускае самаробны бамбовец.
Антон перасеў з самаката на ровар.
Стаська на роліках у Амерыку з'ехаў.
Не збірае арэхаў лясное рэха...

*9 кастрычніка 1999 г.*

## Вобраз самоты

Мой свет ужо не мой, пара спыніцца...
Што я магу зрабіць?
Сто духаў мяне дражняць.
Сто ветраў мяне гоняць і згінаюць,
рвуць ад зямлі ды цягнуць за спадніцу.
Сто ўколаў колюць у паясніцу,

сто дробных лапак топчуцца па спінцы,
а коцік у акенца барабаніць.
Душа ўспінаецца шторанку ўгору,
каб зразумець, што будзе яшчэ горай,
сто словаў блытаюцца несуцешна
у тайнічках неўтаймаваных вершаў.
І што тут можа шчэ са мной адбыцца?
З усіх зашчылін сыплюцца праклёны...
Анёлак Божы, Дружа мой зялёны!

## Дзе ты лётаеш, мая дачушка?

Дзе ты лётаеш,
неўтаймаваная,
засакрэчаная мая дачушка?
У якіх заморскіх людскіх акіянах
маладзічок цябе гушкае?

Твае пленэры, твае вячоркі,
пэндзлікаў тваіх захапленні...
З якіх акіянаў марскія зоркі
цалуюць твае калені?

Каб жа ведалі бабуля з дзедам,
як лучынку ўначы палілі,
донца ў кубачку сагравалі
ды смятанкай цябе паілі,
на руках насілі — сагрэтую,
ад паўночы і да світання,
за табой паўтаралі санеты —
Віка-Віка ды Маня-Маня...

## Едзе-едзе на саначках святы Мікалай

Срэбныя птахі лятуць у наш Край,
іх дрэвы галінкамі ловяць.
Едзе-едзе на саначках святы Мікалай!
З ім ксёндз — Мікалай Ціхановіч.

Засыпаў пагорачкі срэбны снег...
А хто ж гэта коціцца ўлегцы?
А на саначках едзе Буткевіч Алег,
наш біскуп, Яго Эксцэленцыя!

Радзіма схавалася ў срэбны кажух.
Па гурбах, нібы ў карэце,
едзе-едзе наш ксёнжа Ігар Лашук,
найлепшы ксёнжа на свеце!

Кабылка спяшаецца след у след...
Шчэ нехта ў гурбу ступае.
На елачку ў госці прыехаў паэт,
святар Каспяровіч Павел.

Бо нарадзіўся Хрыстос, Божы Сын!
І няма ў нас большага шчасця!
У полі, ў сумётах — ніхто не адзін!
З намі Езус і Божая Маці!

*24 снежня 2017 г.*

## Елачка

Сумавала елка ў лесе,
мы дамоў яе прынеслі.
Гэты дом — не родны дом,
тут часова мы жывём.

Мы жывём, як уначы, —
на світанні скажам слова —
нехта ўчуе выпадкова,
ад нападак не ўцячы.

Светла, елачка, святлей!
Вечар зорны і празрысты!
Нарадзіўся Езус Хрыстус,
хлеб з аплаткай на стале.

Так, паглянуўшы ўгару,
ціха мроіць брат да брата:
— Нібы елачку на свята,
мы ўпрыгожым Беларусь!

# ЗМЕСТ

Дайсці да Каложы ....... 5

## Цішыня

Вадохрышча ....... 11
Грамнічка ....... 12
Папялец ....... 13
Звеставанне ....... 15
Вербніца ....... 16
Споведзь ....... 17
Надзея на адпушчэнне грахоў ....... 18
Хрыстос уваскрос ....... 19
Сёмуха ....... 21
Божае Цела ....... 22
Мы — Тваe падпаскі ....... 23
Фацiма ....... 24
Вітай, Мадонна Фацімы! ....... 25
Маці Божая ў Багданаве... ....... 26
Фацімская малітва ....... 27
Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі... ....... 28
Нараджэнне Найсвяцейшай Панны Марыі ....... 30
Малітва да Маці Божай ....... 31
У кантэмпляцыі ....... 32
На Яна ....... 33
Пётр і Павел ....... 34
Лета з Богам ....... 35
Анёлак ....... 36
Вырай анёлаў ....... 38
Перамяненне Пана на гары Табор ....... 38
Святыя Францішак і Дамінік ....... 39
Тры Арханёлы ....... 40
Малітва за тых, па кім сумуем ....... 42
Адвэнт ....... 43
Батлейка ....... 44

## Ружанец і Крыжовы шлях
(прыватныя медытацыі)

Ружанец ........ 47
Крыжовы шлях ........ 52

## Едзе-едзе на саначках святы Мікалай

Пакідаю вам кветкі ........ 61
Вечаровы смутак ........ 62
Вецер ........ 63
Тры саколікі ........ 64
Мама, тата і я — вінавата ........ 66
Сяброўцы Элі — на ўсе падзеі ........ 67
Настальгія па драўляным доме ........ 68
У Вішневе ........ 70
Святому Яну Паўлу II у дзень развітання ........ 71
Кардыналу Казіміру Свёнтку ........ 72
Ксёндз Адам Станкевіч ........ 73
Ксяндзу Ігару Лашуку на 50-годдзе ........ 74
Ксёндз Юры Ёдзік ........ 75
Біскупу Алегу Буткевічу ........ 76
Ксяндзу Мікалаю Ціхановічу ........ 77
Замест белых півоняў
на развітанне ксяндзу Яну Шуткевічу ........ 78
Светлы ўспамін пра Янку Брыля ........ 80
Варонік ........ 81
Вясковы верш ........ 82
Беларусь — дзяўчынка ........ 83
У родным краі ........ 84
У вёсачцы соннай ........ 84
Дубы святога Мікалая ........ 85
Верш са старога сшытка ........ 87
Вобраз самоты ........ 88
Дзе ты лётаеш, мая дачушка? ........ 89
Едзе-едзе на саначках святы Мікалай ........ 90
Елачка ........ 91

Літаратурна-мастацкае выданне

**Бічэль** Данута Янаўна

# ДАЙСЦІ ДА КАЛОЖЫ

Вершы

Адказная за выданне К. Лялько
Тэхнічны і мастацкі рэдактар А. Глекаў
Карэктар Л. Камінская
Камп'ютарная вёрстка А. Глекаў, Э. Палінеўская

Падпісана да друку 27.11.2017.
Фармат 70х100 $^1/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 5,46. Ул.-выд. арк. 11,00.
Заказ № 480. Наклад 100 асобнікаў.

УП «Выдавецтва „ПРО ХРЫСТО"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/145 ад 21.01.2014.
Пл. Свабоды, 9, п. 2, 220030 г. Мінск.
e-mail: pro-christo@catholic.by http://pro-christo.catholic.by

Паліграфічнае выкананне: Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Інфармацыйна-вылічальны цэнтр Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/41 ад 29.01.2014.
Вул. Кальварыйская, 17-201а, 220004, г. Мінск.

**Бічэль**, Д. Я.
**Б 99** Дайсці да Каложы : Вершы / Бічэль Данута. — Мінск : «ПРО ХРЫСТО», 2017. — 96 с.

**ISBN 978-985-7074-82-2.**

У новай кнізе Дануты Бічэль сабраны вершы-малітвы, ружанцовыя разважанні і паэтычныя медытацыі да набажэнства Крыжовага шляху. «Магчыма, мае вершы будуць падтрымкаю людзям, якія з даверам аддаюцца Божай волі, і, акрамя Божай, іншай падтрымкі не чакаюць», — кажа паэтка пра свае творы, змешчаныя ў гэтай кнізе.

**УДК 821.161.3-821**
**ББК 84(4Беи)**



ISBN 978-985-7074-82-2
9 789857 074822